# ХВАРОБА ЯК СРОДАК РЭАЛІЗАЦЫІ АПАЗІЦЫІ ЖЫЦЦЯ І СМЕРЦІ Ў РАМАНЕ БА ДЗІНЯ «ХАЛОДНАЯ НОЧ»

**М. В. Яромка**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4,*
*220030, г. Мінск, Беларусь, maryna.yaromka@gmail.com*

Мэта артыкула – раскрыць выкарыстанне хваробы як сродку рэалізацыі апазіцыі жыцця і смерці ў рамане Ба Дзіня «Халодная ноч». На ўзроўні сюжэта хвароба выступае адным з рухальнікаў міжасабовага канфлікту і ўнутраных супярэчнасцей Вана Вэньсюаня; на часавым узроўні – суб'ектывізуе ўспрыманне часу, акцэнтуе канчатковасць жыцця і блізкасць смерці, паглыбляючы трагізм твора. Артыкул упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве асвятляе асаблівасці экзістэнцыйнай праблематыкі ў рамане «Халодная ноч» і з'яўляецца адным з першых вопытаў даследавання творчасці Ба Дзіня, што спрыяе выпрацоўцы метадалогіі для далейшага вывучэння творчасці пісьменніка, а таксама твораў кітайскай літаратуры ў цэлым.

***Ключавыя словы:*** Ба Дзінь; бінарная апазіцыя; «Халодная ноч»; экзістэнцыйная праблематыка.

# БОЛЕЗНЬ КАК СРЕДСТВО РЕАЛИЗАЦИИ ОППОЗИЦИИ ЖИЗНИ И СМЕРТИ В РОМАНЕ БА ЦЗИНЯ «ХОЛОДНАЯ НОЧЬ»

**М. В. Яромка**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4,*
*220030, г. Минск, Беларусь, maryna.yaromka@gmail.com*

Цель статьи – раскрыть использование болезни как средства реализации оппозиции жизни и смерти в романе Ба Диня «Холодная ночь». На уровне сюжета болезнь предстает одним из двигателей межличностного конфликта и внутренних противоречий Вана Вэньсюаня; на временном уровне – субъективизирует восприятие времени, акцентирует конечность жизни и близость смерти, углубляя трагизм произведения. Статья впервые в белорусском литературоведении освещает особенности экзистенциальной проблематики в романе «Холодная ночь» и является одним из первых опытов исследования творчества Ба Диня, что способствует выработке методологии для дальнейшего изучения творчества писателя, а также произведений китайской литературы в целом.

***Ключевые слова:*** Ба Динь; бинарная оппозиция; «Холодная ночь»; экзистенциональная проблематика.

# DISEASE AS A MEANS FOR REALIZATION OF THE LIFE AND DEATH OPPOSITION IN BA JIN'S NOVEL «COLD NIGHTS»

**M. V. Yaromka**

*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue,*
*220030, Minsk, Belarus, maryna.yaromka@gmail.com*

The aim of the article is to reveal the usage of disease as a means for realization the life and death opposition in Ba Jin's novel «Cold Nights». On the plot level disease impacts the development of the interpersonal conflict and Wang Wenxuan's internal struggle; on the temporal level it emphasizes the finite nature of life and close proximity to death which intensifies the tragedy in the novel. The article for the first time in Belarusian literary criticism reveals the specifics of existential issues in «Cold Nights»; it is one of the first attempts to study Ba Jin's works which facilitates the development of methodology for further studies of the author's works as well as works of Chinese literature in general.

***Keywords:*** Ba Jin; binary opposition; «Cold Nights»; existential issues.

Сістэмнасць выступае адной з цэнтральных характарыстык знака і тэксту ў рамках структуралізму. Адным з варыянтаў увасаблення сістэмнасці з'яўляюцца бінарныя апазіцыі, якія выяўляюць сэнсавы кантынуум пры дапамозе антытэтычных паняццяў. Бінарныя апазіцыі выкарыстоўваюцца як інструмент аналізу ў працах такіх даследчыкаў, як У. Я. Проп [1], К. Леві-Строс [2], В. Б. Шклоўскі [3], М. М. Бахцін [4], Ю. М. Лотман [5]. Апазіцыя жыцця і смерці дазваляе раскрыць экзістэнцыйную праблематыку твора.

Хвароба героя выступае сродкам рэалізацыі апазіцыі жыцця і смерці ў рамане Ба Дзіня (巴金, 1904–2005) «Халодная ноч» («寒夜», 1947). Галоўны герой твора Ван Вэньсюань хворы на сухоты, што ва ўмовах вайны і беднасці роўнае смяротнаму прысуду, таму дадзеная характарыстыка героя наўпрост закранае пытанні жыцця і смерці. У кітайскім літаратуразнаўстве творчасць Ба Дзіня, у прыватнасці раман «Халодная ноч», вывучаецца ў сацыяльна-палітычным (Гао Дзінь [6], Мао Сыці [7]), псіхалагічным (Гуэй Яфэй [8], Сюн Тын [9]), фармальным (Джао Дзінды [10], Янь Дзін [11]) аспектах. Лёў Вэньсінь разглядае аповед пра хваробу як адну з наратыўных асаблівасцей рамана «Халодная ноч» [12]. Дзоў Лі адзначае ўвагу Ба Дзіня да трагедыі шараговых кітайцаў падчас вайны, выяўленай у страху за ўласнае жыццё і здароўе. У той жа час у рамане адсутнічае матыў гераічнай барацьбы з ворагам, што вылучае «Халодную ноч» на фоне іншых празаічных твораў 1930–1940-х гадоў. На першы план выходзяць фізічныя пакуты асобнага чалавека,

якія прыводзяць да духоўнага заняпаду і абвастраюць канфлікт паміж асобай і грамадствам [13].

Даследчыкі, гаворачы пра кантэкст стварэння рамана, звяртаюць увагу на досвед Ба Дзіня падчас вайны: у тагачасным Кітаі сухоты былі надзвычай распаўсюджанай хваробай, ад якой загінула некалькі блізкіх знаёмых пісьменніка. Хвароба ператварылася ў адзнаку часу, што паўплывала на выбар у якасці галоўнага героя рамана інтэлігента, хворага на сухоты [12, с. 57].

Хвароба паступова разбурае звыклы для Вана Вэньсюаня лад жыцця: ён вымушаны сыходзіць з працы, прасіць адпачынак, што ў выніку пакідае героя без грошай і толькі пагаршае яго стан. Страціўшы прыбытак, Ван Вэньсюань апынаецца цалкам залежным ад жонкі і маці [14, с. 62]. Разам з тым Ван Вэньсюань сутыкаецца з унутраным крызісам: амбітныя мары маладосці завяршаюцца расчараваннем, надзея на будучыню змяняецца прызнаннем уласнай бездапаможнасці і незадаволенасцю самім сабой [14, с. 65]. У фінале твора Ван Вэньсюань не можа рухацца і гаварыць, што канчаткова ператварае яго ў вонкавага назіральніка, выключанага з жыцця.

Ба Дзінь раскрывае фізічныя і псіхалагічныя пакуты праз выкарыстанне ўнутраных маналогаў, якія ілюструюць зблытанасць думак героя, што пераносіць хваробу ў плоскасць псіхікі і паказвае сувязь душэўнага стану з навакольнай сітуацыяй. Сувязь фізічнага і духоўнага выяўляецца ў дынаміцы: актывізацыя перажыванняў Вана Вэньсюаня супадае з развіццём хваробы і стратай сіл [12, с. 58].

Лёў Вэньсінь адзначае сюжэтную функцыю хваробы: калі Ван Вэньсюань адчувае сябе блага, канфлікт паміж маці і жонкай адступае на другі план [12, с. 58]. Пагаршэнне фізічнага стану становіцца вытокам паляпшэння адносін у сям'і, што выяўляе парадаксальнасць і другаснасць светапогляднага канфлікту паміж героямі: супярэчнасць перакананняў мала чаго вартая перад пагрозай смерці. У той жа час дадзеная сітуацыя набывае трагічнае гучанне, бо дзеля таго, каб маці і жонка маглі прымірыцца, узгадаць пра дабрыню і спагаду, Ван Вэньсюань мусіць апынуцца ў небяспецы.

Страх перад смерцю спалучаецца са страхам нашкодзіць сям'і, прымусіць іх баяцца, што вымушае Вана Вэньсюаня хаваць праўду: «他不肯让母亲和妻子知道他吐血的事» (Ён [Ван Вэньсюань] не хацеў, каб маці і жонка даведаліся, што ён кашляе крывёй. *Пераклад з кітайскай тут і далей мой – М. Я.*) [14, с. 64]. Аднак схаваць хваробу ад сябе самога немагчыма, хаця герой намагаецца пераканаць сябе, што ён можа ачуняць [14, с. 66]. Разуменне блізкасці смерці і неабходнасць удаваць,

што нічога не змянілася, утвараюць канфлікт унутраных перажыванняў і вонкавага стану, падкрэсліваюць разрыў паміж героямі ў ацэнках і каштоўнасцях (побытавыя клопаты маці супраць асэнсавання смерці Ванам Вэньсюанем), што яшчэ больш адрывае галоўнага героя ад іншых людзей.

Хвароба не толькі выяўляе асабістую трагедыю Вана Вэньсюаня, але і ўводзіць матыў хуткаплыннасці жыцця, што перагукаецца са шкадаваннем герояў пра страчаныя мары маладосці [12, с. 57]. Невылечная хвароба, такім чынам, звязваецца з успрыманнем часу, змяняе яго, набліжаючы смерць і робячы яе больш рэальнай. Ван Вэньсюань не верыць, што хутка памрэ: «反正他不会这么早就死去» (Не можа быць, што ён памрэ так хутка) [14, с. 57]; аднак падчас хваробы ён цалкам страчвае надзею на добры зыход: «我死，我一个人死» (Я памру, я памру ў адзіноце) [14, с. 66]. У кантэксце часавай арганізацыі твора хвароба працуе на расслойванне часу: аб'ектыўны, агульны для ўсіх час вымяраецца навакольнымі падзеямі, тады як для Вана час апынаецца зараней скончаным, фінальная кропка гэтага часу вядомая ўжо тады, калі шлях да яе яшчэ не пройдзены.

Разуменне, што жыццё скончанае, змяняе погляд героя на навакольную сітуацыю: у яго яшчэ менш жадання актыўна дзейнічаць, адстойваць уласны погляд. Акрамя таго, адсутнасць будучыні абясцэньвае мінулае: Ван Вэньсюань вінаваціць ува ўсіх няшчасцях сябе, сваю цярплівасць і памяркоўнасць [14, с. 86]. Дадзенае разуменне часу выяўляецца і ў гісторыі Тана Боціна, які востра перажывае гібель жонкі і дзіцяці, адмаўляецца ад ранейшых літаратурных задум, перастае лічыць сябе чалавекам [14, с. 74]. Ён кажа: «我完了，我已经死了» (Мне канец, я ўжо мёртвы) [14, с. 73]. Ба Дзінь, такім чынам, паказвае чалавека, для якога смерць стала фактам падчас жыцця, ператварыўшы жыццёвы рух у бясчасавую статыку смерці.

Калі хвароба як пагроза жыццю ўяўляецца важнейшай за светапоглядны канфлікт унутры сям'і, то перад больш глабальнай пагрозай – акупацыяй – хвароба Вана Вэньсюаня страчвае сваё значэнне. Лёс асобнага чалавека выяўляецца дробязным, яго жыццё на фоне вялікіх падзей не каштуе нічога [12, с. 59]. Месца асабістага жыцця ў агульным гістарычным кантэксце вызначаецца наступным чынам: экзістэнцыйная пагроза пераважвае маральныя супярэчнасці, аднак блякне перад глабальнымі гістарычнымі працэсамі; чалавек стаіць у цэнтры ўласнага жыцця, дзе яго існаванне апынаецца вышэй за ўсё, але ў маштабах грамадства асабістая трагедыя не мае ніякай вагі.

Такім чынам, хвароба з’яўляецца сродкам рэалізацыі апазіцыі жыцця і смерці ў рамане Ба Дзіня «Халодная ноч». Хвароба галоўнага героя Вана Вэньсюаня выступае тыповай характарыстыкай ваеннага часу, раскрывае экзістэнцыйную праблематыку на сюжэтным і часавым узроўнях і выводзіць яе ў гістарычны і культурны кантэкст, паказваючы асабісты досвед на фоне глабальнай трагедыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Пропп В. Я.* Морфология волшебной сказки. СПб. : Питер, 2021. 253 с.
2. *Леви-Строс К.* Структурная антропология. – М. : Наука, 1983. 536 с.
3. *Шкловский В. Б.* О теории прозы. – М. : Федерация, 1929. 265 с.
4. *Бахтин М. М.* Вопросы литературы и эстетики. – М. : Художественная литература, 1975. 504 с.
5. *Лотман Ю. М.* Структура художественного текста. – М. : Искусство, 1970. 384 с.
6.高谨 从《寒夜》婆媳关系看巴金对五四精神的反思. – 四川师范大学, 2014. – 36页.
7.毛斯琪 《寒夜》：对“五四”精神的疏离 // 文学教育. – 2019. – 36–37页.
8.桂亚飞 分裂的身份与认同的危机——《寒夜》主人公悲剧原因新论 // 黎明职业大学学报. – 2022年, 第1期. – 19–25页.
9.熊婷 巴金《寒夜》中小人物的创伤解读 // 文学教育. – 2021年, 第3期. – 27–29页.
10.赵婧迪 从主体视角的流动看巴金《寒夜》的叙事张力 // 湖南科技学院学报. – 2017年, 第9期. – 27–30页.
11.闫婧 论巴金《寒夜》中的空间叙事艺术 // 淮北职业技术学院学报. – 2022年, 第1期. – 109–112页.
12.刘文欣 日常书写、母题重述与疾病叙事 // 写作. – 武汉大学, 2022. – 第2期. – 52–59页.
13. *Zou L.* Toward a New Narrative About China's Anti-Japanese War: Reading Bodily Anxiety in Ba Jin's Cold Nights // Journal of Modern Literature. Indiana University Press, 2021. Vol. 44, no. 2. P. 93–105.
14.巴金 寒夜. – 武汉 : 长江文艺出版社, 2023. – 243页.